накатывает тошнота» [1]; «…я сильнее всего ощущал ярость – непримиримую ярость, обращенную на Си Джея за его бесчестную уверенность, что все люди, и я в том числе, продажны» [1]), но он наивно надеялся, что сможет укрыться от тлетворного влияния тестя, олицетворяющего власть денег, в своем уютном семейном мире. Надежды Хардинга оказались тщетными. В этом и состоит великая американская трагедия: вера в могущество денег порождает ложь, лицемерие и чувство вседозволенности, которые вторгаются даже в интимный мир чувств, нивелируют нравственные понятия, разрушают нормальные человеческие отношения и превращают людей в рабов общественного мнения.

## Литература


1. *Квентин, П.* Он и две его жены [Электронный ресурс] / П. Квентин. – Режим доступа: https://librebook.me/the_man_with_two_wives. – Дата доступа: 30.08.2022.
2. *Логинов, Ю.* «Американская мечта» в романе Т. Драйзера «Финансист» [Электронный ресурс] / Ю. Логинов. – Режим доступа: http://e-lib.mslu.by/bitstream. – Дата доступа: 01.09.2022.
3. *Митрохин, Л.* Американские миражи [Электронный ресурс] / Л. Митрохин. – Режим доступа: http://leftinmsu.narod.ru. – Дата доступа: 03.09.2022.
4. *Quentin, P.* The Man with Two Wives [Electronic resource] / P. Quentin. – Mode of access: https://archive.bookfrom.net/patrick-quentin/308484-the_man_with_two_wives.html. – Date of access: 28.08.2022.



*М. С. Рак (Беларусь)*


# АДМЕТНАСЦЬ ГАТЫЧНАЙ ПРОЗЫ Д. СЭТЭРФІЛД І Л. РУБЛЕЎСКАЙ

Гатычная літаратура заўсёды выклікала ўвагу ў чытачоў сваёй захапляльнасцю, паэтызацыяй звышнатуральнага, містычнасцю і таемнасцю, а адметнасцю паэткі твораў напісаных з арыентацыяй на готыку ці неаготыку стала квінтэсэнцыя жахлівага, незвычайнага, невытлумачальнага: «У гэтых творах настолькі моцныя рысы таямнічага і загадкавага, настолькі незвычайныя і казачныя апісанні, што яны ў значнай ступені дапамагаюць абудзіць ўсю моц ўяўлення, запоўніць вашу душу велічнымі і таямнічымі вобразамі» [2].

Непасрэдна гатычны раман як непаўторны і адметны літаратурна-мастацкі жанр узнік у Англіі на мяжы XVIII–XIX стагоддзяў у час ранняга рамантызму. Заснавальнікам гэтага жанру стаў Хорас Уолпал, твор якога «Замак Атранта» да гэтага часу з'яўляецца папулярным у чытачоў. Росквіт жа готыкі ў літаратуры

пачынаецца ў 90-я гг. XVIII стагоддзя, калі заходнееўрапейскае грамадства, сутыкнуўшыся з крывавым тэрорам і гвалтам, паспрабавала вызваліцца ад сваіх комплексаў і жахаў, увасобіўшы іх у вобразах гатычнай літаратуры.

Некаторыя даследчыкі вызначаюць толькі тры адметнасці сталых гатычных раманаў: «суб'ектывізм іх аўтараў, схільнасць да яркай малюнкавасці, якая становіцца жарсцю да звышнатуральнага і жахлівага, і, па-трэцяе, бессвядомае супрацьпастаўленне сваёй творчасці эстэтычным прынцыпам асветніцкага рэалізму» [3]. Мы ж адзначым наступныя дамінантныя асаблівасці гатычных твораў: таямніца ў аснове сюжэта; наяўнасць звышнатуральнага, якое не тлумачыцца логікай; жахліва-вусцішны пачатак; выключныя асобы, незвычайныя знешне ці інфернальныя істоты (прывіды, ведзьмы, варажбіткі, пачвары і інш.) [4]; разгортванне падзей у напаўразбураных будынках і змрочных месцах (замках, на могілках, вежах, халодных пустках, закінутых дамах і г. д.), літаральна наскрозь прасякнутых атмасферай вусцішнасці; наяўнасць галоўнай (часта і другараднай) жанчыны-гераіні з паламаным або нешчаслівым лёсам. Дададзім да пералічаных фактараў яшчэ і адметнасць часава-прасторавай арганізацыі гатычных твораў: паралельны хранатоп, які падсвечвае сучаснасць мінулым, і такім чынам арганізуе тэкст, што ён становіцца «слаёным пірагом».

Адной з самых яскравых прадстаўніц гатычнага жанру ў брытанскай літаратуры з'яўляецца Дзіяна Сэтэрфілд, якая неаднаразова зазначала, што ў юнацтве захаплялася творамі Льва Талстога, Фёдара Дастаеўскага, Шарлоты і Эмілі Брантэ, Джэйн Осцін і інш., у многіх з якіх можна таксама знайсці рысы гатычнай літаратуры. Раман «Трынаццатая казка» напісаны ў поўнай адпаведнасці з гатычнай традыцыяй: наяўнасць гатычнага маёнтка з мноствам таямніц, у якім жыве Віда Вінтэр; зарослы сад, дзе галоўная гераіня – Маргарэт Лі – нібыта сустракаецца з прывідам, а на самой справе сапраўднай дачкой гаспадароў маёнтка; знікненне і смерць (Чарлі, Ізабэла, Эстэр і інш.); вогнішчы і пажары (Анджэлфілд-Хаўс); цёмныя, дажджлівыя ночы; кровазмяшэнне; садызм; невылечная смяротная хвароба і інш. Адным з ключавых прыёмаў аповеду Д. Сэтэрфілд з'яўляецца такая наратыўная стратэгія, як «кніга ў кнізе»: падзеі апісваюцца з пункту гледжання Маргарэт, якая складае біяграфію знакамітай пісьменніцы Віды Вінтэр, а таксама самой Віды і дзённіка былой гувернанткі Эстэр і Аўрэліўса.

Прозе ж Людмілы Рублеўскай уласціва спалучэнне неарамантычнага, гатычнага, містычнага падыходаў да ўзнаўлення мінулага, без ведання якога, на думку аўтара, не будзе будучыні. Працягваючы рамантычныя традыцыі еўрапейскай і беларускай літаратур, пісьменніца ставіць праблемы годнасці чалавека, сучаснасць пераплятаецца з даўнінай і пацвярджае тэзіс пра адказнасць кожнага пакалення і за мінулае, і за будучыню. Гэта сведчыць пра плённае выкарыстанне аўтарам традыцый англійскай літаратуры.

У паралельным рамане «Золата забытых магіл» Л. Рублеўская імкнецца выявіць вытокі нацыянальнай ментальнасці, якая дазваляе беларусам «людзьмі

звацца», уводзіць паняцце «міфалагічны час» (памяць, містыка снабачанняў, народнае разуменне свету). Паралельны хранатоп як адметнасць мастацкай інтэрпрэтацыі сівой даўніны і паказчык паспяховасці аўтарскай стратэгіі пісьменніцы актуалізуе мінулае і сучаснасць: гістарычны час не дае спакою людзям, хавае шмат таямніц, якія чакаюць свайго адкрыцця; час галоўнай гераіні ў сваю чаргу пераплятаецца з 1863–1864 гадамі.

У гатычных апавяданнях «Шклянка цемры з прысмакам крыві», «Дыярыуш пані», «Жаніх пані Данусі» і інш. актыўна выкарыстоўваюцца элементы гатычнай паэтыкі: дзеянне адбываецца ў змрочных замках, сядзібах, касцёлах, на могілках, пераважна ноччу, у неспрыяльнае надвор'е, прысутнічаюць тагасветныя істоты, чытач запалоханы прадчуваннем блізкай трагедыі.

Гатычны раман «Скокі смерці» – цікавая мастацкая знаходка пісьменніцы, «твор, які сінтэзуе элементы гатычнага, прыгодніцка-дэтэктыўнага, філасофскага раманаў, дзе удала спалучаны нацыянальна-гістарычныя (этнанацыянальная самаідэнтыфікацыя беларусаў, захаванне гістарычнай памяці) і так званыя вечныя праблемы (пачуццё і абавязак, вернасць і здрада, мэтазгоднасць і мараль, дабро і зло)» [1, с. 150]. Пісьменніца асучаснівае традыцыі класічнага англійскага гатычнага рамана. Сам жанр гатычнага рамана, як абалонка твора, абраны пісьменніцай наўмысна: звяртаючыся да таямніц і загадак змрочнага былога, Л. Рублеўская імкнецца падкрэсліць сувязь мінуўшчыны і будучыні, паказаць, да чаго можа прывесці выкарыстанне звышзброі прагнучымі сусветнага панавання людзьмі.

Л. Рублеўская ідзе ўслед за жанравым канонам: яе раман заснаваны на фантастычным сюжэце, дзеянне адбываецца ў незвычайных абставінах (ратуша, старажытны замак, закінутая мясцовасць, сутарэнні і г. д.), а рэалістычнасць у апісанні і дэталяў побыту стварае напружанасць аповеду. Варта адзначыць, што ў жанравай парадыгме рамана, нароўні з гатычнымі, выкарыстоўваюцца і рамантычныя, і дэтэктыўныя, і фантастычныя элементы.

Цэнтральны і нязменны вобраз гатычных твораў – замак – прысутнічае ў творы і трансфармуецца ў адпаведнасці з мясцовымі рэаліямі: гэта вежа, якую абыходзяць, як магілу вісельніка, маёнтак ўплывовага алігарха, старадаўні палац, апошні ўладальнік якога звар'яцеў. У рамане прысутнічаюць таксама наступныя «гатычныя» топасы: халодныя пусткі, закінутыя дамы і могілкі, апусцелыя ўдалечыні ад цывілізацыі мястэчкі, сутарэнні, схаваныя пераходы і схованкі. Пераважная пара года, у якую разгортваюцца падзеі, – восень, часта на мяжы з зімой, што стварае змрочную і трывожную атмасферу паступовага памірання і адзіноты. Дзеянне часта разгортваецца ў цёмны час або ў непагоду, калі неба нізка зацягнута шэрымі аблокамі, сонечныя промні вельмі рэдка з'яўляюцца на старонках. У стылістыцы ўрбаністычнай готыкі горад і яго будынкі набываюць рысы падземнага царства мёртвых, дзе асфальт – рака Лета, мухі (інсекты) – вешчуны Аіда, зграі гарадскіх птушак нагадваюць магільныя крыжы, а транспарт параўноўваецца з ладдзёй Харона.

Пісьменнікі ў творах з гатычнай афарбоўкай не проста ўзнаўляюць падзеі мінулага, а стварае шырокапанарамнае мастацкае палатно, сатканае з лёсаў герояў. Падобны прыём можна знайсці ў творах Д. Сэтэрфілд (гісторыя сямейнага пракляцця «Трынаццатая казка», «Бэлман і Блэк, ці Незнаёмец у чорным»), А. Мёрдак (перапляценне гісторыі і сучаснасці «Вучань філосафа», «Чорны прынц»). Арыгінальная аўтарская інтэрпрэтацыя жыцця і дзейнасці канкрэтнага персанажа ў названых творах становіцца адным са спосабаў філасофскага заглыблення ў свет чалавека, рэфлексіяй над надзённымі і вечнымі праблемамі.

Як і ў Д. Сэтэрфілд, у гатычных творах Л. Рублеўскай прысутнічаюць і пераплятаюцца некалькіх часавых пластоў, аднак гісторыя краіны інтэрпрэтуецца і ўспрымаецца праз асабістае і сямейнае. У цэнтры аповеду, як правіла, аказваецца кананічны гатычны матыў радавога праклёну, які можа быць звязаны з рэальным грахом або злачынствам, што перадаецца з пакалення ў пакаленне выпадковым, а часцей наўмысным знішчэннем уласнай гістарычнай памяці, што непазбежна прыводзіць да асобаснага крызісу, варажнечы паміж пакаленнямі адной сям'і. Яшчэ адзін важны гатычны матыў у творах Л. Рублеўскай – матыў ізаляцыі, які знаходзіць вырашэнне пра паказ адзіноты герояў. Цэнтральнымі персанажамі становяцца людзі, «не такія, як усе»: несучасныя «паненкі», паўстанцы, ідэалісты-выгнаннікі, добраахвотныя пустэльнікі, якія атрымліваюць канатацыйную ацэнку «вар'ят», «дзівак».

Гатычная традыцыя арганічна ўваходзіць у сучасны гістарычны раман Л. Рублеўскай дзякуючы актуальнасці сваёй праблематыкі: аднаўленне сямейных сувязяў і пераемнасці пакаленняў, ўсведамленне беларусамі нацыянальнай адметнасці, пошук раўнавагі ў хаатычным свеце. Гатычная стылістыка дазваляе Л. Рублеўскай белетрызавана паказаць мінулае і сучаснасць у іх непарыўнай сувязі, выявіць супярэчнасці ў гістарычным развіцці і адлюстраваць праблемы і комплексы новых пакаленняў, а таксама паразважаць над прычынамі і спосабамі іх пераадолення.

## Літаратура


1. *Бароўка, В. Ю.* Раманы Людмілы Рублеўскай як мастацкі дыялог з жанравай традыцыяй/ В. Ю. Бароўка // Białorutenistyka Białostocka. – Т. 7. – Białostock. – 2015. – С. 147–160.
2. *Watt, I.* The Rise of the Novel [Electronic resource] / I. Watt. – Mode of access: http://www.uni-koeln.de/phil-fak/englisch/lehre/downloads/ essaythemen_ma.htm. – Date of access: 28.08.2022.
3. *Николюкин, А.* Готический роман / А. Николюкин // Вопросы литературы. – № 2. – С. 248.
4. *Лавкрафт, Г.* Сверхъестественный ужас в литературе [Электронный ресурс] / Г. Лавкрафт. – Режим доступа: http://lib.ru/INOFANT/LAWKRAFT/sverhestestvennyj_uzhas_v_literature.txt. – Дата доступа: 28.08.2022.